**Гніламёдаў У.В. (Мінск)**

## Наватарства Максіма Багдановіча

Загадка М. Багдановіча, над якой думалі многія, у тым ліку і М. Стральцоў у вядомым эсэ, – адна з вечных тэм беларускай літаратуры і літаратуразнаўства. Яе сэнс і маштабы немагчыма ўявіць і зразумець без уліку таго несумненнага ўздзеяння, якое аўтар «Пагоні» аказваў і аказвае на ўвесь працэс нацыянальнага Адраджэння, на развіццё нашага мастацтва, літаратуры і грамадскай свядомасці ў цэлым.

«У чым жа неверагодна магічная сіла яго слова, яго голасу? – такое пытанне задавала самой сабе Я. Янішчыц у артыкуле «З Максімам Багдановічам» і адказвала: «Мне светла і роздумна з магутным словам вялікага Максіма Багдановіча. З яго незгасальнай энергіяй. З Яе Вялікасцю – Паэзіяй. Бо яна, гэтая Вялікая Паэзія, сама таго не ведаючы, ачышчае шчыльную атмасферу <…> нават ад тых «пладавітых» набыткаў у нашай неабдымнай сучаснай творчасці, за якімі падчас шмат пустаслоўя і эпігонства, мітусні і дробязных рахункаў, манернасці і штучнага высілку радка!» [3, с. 227].

Зорка Багдановіча належыць да сузор'я Купалы і Коласа. Ён і пачынаў амаль, як яны, старэйшыя паплечнікі. Вершы пачатковага перыяду – «З песняў беларускага мужыка» і «Краю мой родны…» – выглядалі ў ідэйна-стылёвым плане блізкімі да купалаўскіх. Адзначым, што Беларусь у тыя часы (а магчыма, нават у нейкай ступені і сёння) мела больш фальклорны тып культуры, чым індывідуальна-псіхалагічны, што пэўным чынам адбілася і на раннім этапе творчасці Я. Купалы і Я. Коласа. М. Багдановіч бачыў своеасаблівасць Я. Купалы і Я. Коласа (першы з пісьменнікаў, адзначаў ён, прасякнуты «смеласцю, жыццёвай сілай…»; Колас – «пісьменнік просты, спакойны і заўсёды сабе роўны»). Ён не мог абмінуць іх вопыту. Аднак далей развіццё пайшло ў іншым напрамку – у напрамку сцвярджэння і гарманізацыі жыцця, расхіствання канона, збліжэння паэтычнага слова з усёй стыхійнай непасрэднасцю прыроднага быцця чалавека.

З аднаго боку, гэта была традыцыйна заангажаваная паэзія, прасякнутая барацьбяным духам, з другога – мела смеласць самастойна вырашаць спецыфічныя задачы, зыходзячы з сваіх у многім новых эстэтычных мажлівасцей.

Блішчыць у небе зор пасеў;
У полі – рунь і ў небе – рунь.
Да рэчкі лецячы, узляцеў
Між імі марай белы лунь.
Кажан пранёсся на крылах,
Стракочуць конікі ў траве,
Снуюцца мышы па палях,
Здаецца – ўсё вакол жыве [1, с. 61].

Верш мае традыцыйна апавядальны характар – аўтар шчодры на падрабязнасці «знешняга» жыцця, аднак, пададзеныя вельмі асабіста, яны ўзмацняюць яго лірызм. Аказваецца, свет паэта – гэта не проста навакольны свет, які ён ёсць, – ён адзначаны прысутнасцю душэўна чулай чалавечай асобы, здольнай на шматбаковае і нязмушанае самараскрыццё. У эпоху, калі з'яўлялася

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на свет беларуская інтэлігенцыя, калі ў тутэйшым чалавеку нараджалася і ўмацоўвалася нацыянальна свядомае пачуццё асобы, – павінен быў з’явіцца такі паэт, як М. Багдановіч. Усё ў яго вершах падкрэслівае асабістае – успрыманне, перажыванне, настрой, інтанацыя. Разам з тым гэта не камерная паэзія – яна адкрыта ў вялікі свет народнага жыцця, па-за якім асабістае пачуццё было б аднабаковым і няпоўным.

Апавяданні М. Багдановіча таксама, як і вершы, здзіўляюць сваёй сэнсавай ёмістасцю, шырокім падыходам да чалавечага жыцця, да яго карэнных пытанняў. Зрэшты, аўтара хвалявалі тыя ж самыя пытанні і супярэчнасці рэчаіснасці, што і ўсю тагачасную беларускую літаратуру, аднак, у параўнанні са сваімі сучаснікамі, не гаворачы ўжо аб папярэдніках, ён шукаў новы пункт погляду на з’явы жыцця. М. Багдановіч адным з першых у беларускай літаратуры імкнуўся перадаць агульнае праз асаблівае, знешняе праз унутранае, сацыяльнае праз індывідуальнае, псіхалагічнае. Па сутнасці ён сцвердзіў новае разуменне часу і прасторы, пераканаўча давёў сваё ўменне абжываць гісторыю, паглыбляцца ў яе віры і тоні і набліжаць да сучаснасці. Глыбокая павага да гістарычнай спадчыны – адзін з важнейшых светапоглядных прынцыпаў творчай канцэпцыі М. Багдановіча – паэта і навукоўца.

Беларуская літаратура ХХ ст. у параўнанні з папярэднімі перыядамі характарызавалася новай дынамікай свайго мастацка-філасофскага развіцця, разглядаючы якое ў першыя дзесяцігоддзі ХХ ст., трэба абавязкова браць пад увагу рэзкае ўзмацненне працэсу суб’ектывізацыі мастацкага мыслення, што знайшло адлюстраванне ў той ці іншай ступені ў творчасці ўсіх пісьменнікаў. Творчасць М. Багдановіча аказалася асабліва падатлівай да гэтага працэсу. Ён нарадзіўся на пераломе эпох, калі мяняўся светапогляд людзей, уяўленні аб часе, прасторы, руху, прычыннасці і дэтэрмінізме. Па-новаму асэнсоўвалася сувязь чалавека з грамадствам, гісторыяй, прыродай, космасам.

Далёкая зорка Венера саграе сваім цяплом і святлом пачуцці закаханых у вершы «Раманс» («Зорка Венера ўзышла над зямлёю…»): «Глянь іншы раз на яе, – у расстанні / Там з ёй зліём мы пагляды свае… / Каб хоць на міг уваскрэсла каханне, / Глянь іншы раз на яе» [1, с. 77]. Цяжка сказаць, ці чытаў гэты верш савецкі паэт У. Нарбут – маладзейшы сучаснік беларускага песняра, але кажуць, што ад’язджаючы на Калыму, пры развітанні ён з каханай паабяцалі адно другому штовечар глядзець у дамоўлены час на адну зорку, спадзеючыся сустрэцца поглядамі.

У паэзіі М. Багдановіча беларуская рэчаіснасць адкрылася новымі сваімі бакамі. Ён не толькі востра адчуў сацыяльна-гістарычную дэтэрмініраванасць характару чалавека, але, разам з тым, і магчымасці яго духоўнага абуджэння, творчага развіцця, якія з’явіліся на ўзмежжы XIX – ХХ стст. Расчараванне ў грамадска-палітычнай сістэме і яе каштоўнасцях узмацніла ў ім цікавасць да чалавечай асобы, якая ўяўлялася М. Багдановічу сярод усеагульнай няпэўнасці і дрыгвяністасці калектывісцкай супольнасці выспай устойлівасці. Ён сцвярджаў каштоўнасць чалавечай індывідуальнасці, павагу да яе. У яго творчасці асоба ўсведамляе сябе духоўна, маральна, эстэтычна. Ён пісаў пра вядомага ўкраінскага паэта В. Самійленку: «К людям, к человечеству никогда не уставала возвращаться мысль Самийленко, вернее – она от них почти не отрывалась. <...>

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Однако люди не заслонили ад него человека. Напротив, он живёт интересами человеческой личности, именно они являются мерилом ценности социального уклада, и урезать их во славу какого-либо идола или идеала он не покусился ни разу» [2, с. 311]. Але ж гэта можна сказаць і пра самога М. Багдановіча!

З яго творчасцю ўпершыню ў беларускую літаратуру з такой незвычайнай паўнатой пранікае ўнутранае жыццё чалавека. Лірычная асоба паэта месціць у сабе цэлы свет. Імкненне да «быційных» тэм, якія хвалявалі ўсю зямную цывілізацыю, гарманічна спалучалася ў яго з цікавасцю да прадметаў прыземленых, побытавых, але духоўна і псіхалагічна вельмі насычаных. Тут назіраецца плённы сінтэз нізкага і ўзнёслага, малога і вялікага, духоўна значнага і больш дробнага, паўсядзённага. З аднаго боку, рамантычна ўзвышаная «Пагоня», а з другога – «Сцюжа, мрок… Я ізноў хвараваты. / У сэрцы – думак дакучных цяжар. / Заварыць бы гарачай гарбаты, / Разагрэць бы хутчэй самавар. / Запяе ён і тонка, і ціха, / Зазіяе на спод аганьком, – / І развеецца цёмнае ліха / Над маім абагрэтым кутком» [1, с. 308]. Спакойны тон, чысты голас, нязмушаная інтанацыя – паэзіяй стала паўсядзённая проза ў непадманнай разнастайнасці сваёй жыццёвай рэальнасці і псіхалагічнага зместу.

Багдановіч-лірык імкнуўся ў новыя для беларускай паэзіі тэматычныя пласты, якія да гэтага не лічыліся прыдатнымі для эстэтычнага асваення. Ён сцвярджаў адзінства матэрыяльнага і духоўнага, жыццёвага коласа і кветкі васілька, рашуча абвяргаючы тэарэтычныя канцэпцыі, якія недаацэньвалі або прыніжалі катэгорыю прыгожага ў жыцці і мастацтве.

Мастацкія дасягненні і адкрыцці М. Багдановіча аказалі значны ўплыў (хаць і ў рознай меры) на ўсе наступныя этапы развіцця беларускай літаратуры і мастацтва, яны адпавядаюць памкненням сучаснай эпохі.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск, 2001. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск, 2001. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 1993.
3. Янішчык, Я. З Максімам Багдановічам / Я. Янішчыц // Максім Багдановіч. Пясняр чыстае красы : успаміны, артыкулы, прысвячэнні ; уклад. Т. Шэляговіч. – Мінск, 2011. – С. 226–232.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ